Эмануіл ІОФЭ

Да 125-годдзя
са дня нараджэння

НЕВЯДОМЫ ЗМІЦЕР ЖЫЛУНОВІЧ

Пра жыццё і дзейнасць гэтага чалавека напісаны сотні газетных і часопісных артыкулаў, дзве кнігі, у тым ліку і дакументальная аповесць. На першы погляд здаецца, што мы ведаем пра яго ўсё. Але гэта толькі здаецца.

Некаторыя старонкі жыцця і дзейнасці Зміцера Жылуновіча — Цішкі Гартнага — нават сёння застаюцца невядомымі ці малавядомымі. Раскрыць іх нам дапамогуць беларускія і расійскія архівы, успаміны знаёмцаў, а таксама інтэрв'ю аўтара гэтых радкоў з былымі саратнікамі пісьменніка і дачкой Галінай.

ГАРТАЮЧЫ СТАРОНКІ

Дзіўна, але ў шэрагу даволі аўтарытэтных афіцыйных выданняў пра Жылуновіча дапушчаны памылкі і пададзены недакладныя біяграфічныя звесткі.

Так, на старонцы 382 трэцяга тома «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (ЭГБ) (Мінск, 1996) адзначаецца, што яго бацькі былі беззямельнымі сялянамі. У іншых афіцыйных выданнях сцвярджаецца, што Зміцер Жылуновіч быў сынам рабочага. У сапраўднасці яго бацька Хведар Жылуновіч спачатку быў беззямельным селянінам, пасля стаў чорнарабочым, а потым працаваў гарбаром.

У гэтым жа выданні на старонках 382—383 падкрэсліваецца, што ў 1904 годзе Зміцер Жылуновіч уступіў у Капыльскую раённую арганізацыю Паўночна-Заходняга камітэта. Быў членам бюро камітэта, кіраўніком культурна-асветнага аддзела. Але з 1832 года Капыль быў прыватнаўладальніцкім мястэчкам князя Вітгенштэйна і адносіўся да Слуцкага павета, і толькі з ліпеня 1924 года стаў раённым цэнтрам. У 1903 годзе ў гэтым мястэчку была створана група, а ў 1905 годзе — арганізацыя РСДРП. Таму 16-гадовы Зміцер у 1904 годзе ўступіў у групу РСДРП, а не ў Капыльскую раённую арганізацыю. І толькі праз два гады стаў членам партыйнага камітэта сацыял-дэмакратычнай арганізацыі, адказным за культурна-асветніцкую работу сярод моладзі.

У 1990 годзе ў Мінску ў выдавецтве «Университетское» пад грыфам Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП Беларусі пад рэдакцыяй яго дырэктара — доктара гістарычных навук, прафесара Р. П. Платонава выйшла кніга «Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты». На старонцы 338 гэтага выдання сцвярджаецца, што ў 1923 годзе Змітраку Хведаравічу Жылуновічу было прысвоена званне народнага пісьменніка БССР.

У гэтым сказе дапушчаны дзве памылкі.

Па-першае, справа ў тым, што ў 1923-м, калі пралетарскі пісьменнік, член ЦВК БССР Цішка Гартны ўрачыста адзначаў 15-годдзе сваёй творчай дзейнасці, калегія Народнага камісарыята асветы Беларусі прапанавала «даць вядомаму беларускаму песьняру і палітычнаму дзеячу Зьмітруку Жылуновічу» званне народнага паэта (а не народнага пісьменніка. — **Э. І.**). Беларусі.

Па-другое, у тым жа 1923 годзе пленум ЦК Кампартыі Беларусі прыняў пастанову аб прысваенні З. Х. Жылуновічу звання народнага паэта Беларусі, аднак па невысветленых абставінах гэта пастанова не была выканана. Даследчыкі называюць розныя прычыны, у тым ліку і шумнае пісьменніцкае застолле ў сувязі з 15-годдзем творчай дзейнасці Цішкі Гартнага. Гаворка ідзе пра банкет, які арганізавала кіраўніцтва Інбелкульта ў Саўнаркамаўскай сталоўцы.

www.maladost.lim.by Цытатнік.
Лепшыя цытаты для школьных сачыненняў

У 2002 годзе ў Мінску выйшла велізарная манаграфія (688 старонак) беларускага вучонага-філосафа і гісторыка, кандыдата філасофскіх навук Т. С. Процькі «Становленне советской тоталитарной системы в Беларуси (1917—1941 гг.)». На старонцы 658 гэтай кнігі ў кароткай біяграфічнай даведцы «Жнлунович Дмнтрий Федорович» напісана: «В октябре 1936 г. арестован… В апреле 1936 г. в больннце покончил жизнь самоубнйством. Реабнлитнрован в 1954 г.».

У кожным сказе тут ёсць памылкі. У першым — адна, у другім — адна ці нават дзве, у трэцім — адна, але траістая.

Па-першае, Жылуновіч быў арыштаваны не ў кастрычніку, а ў лістападзе 1936 года. Адны крыніцы адзначаюць, што гэта адбылося 15 лістапада, а другія — 16 лістапада.

Па-другое, Зміцера Хведаравіча не стала 11 красавіка 1937 года, а не ў красавіку 1936 года (тут, хутчэй за ўсё, дапушчана памылка друку. — **Э. І.**). Што датычыць прычыны яго смерці, то існуюць дзве версіі.

Першая — афіцыйная: Жылуновіч памёр ад гангрэны лёгкіх. Другую можна сфармуляваць наступным чынам: ёсць звесткі, што ён пакончыў жыццё самагубствам.

Цяпер наконт рэабілітацыі. Яна як быццам прайшла тры этапы.

16 кастрычніка (а не 15 кастрычніка, як падае ЭГБ. — **Э. І.**) 1955 года крымінальная справа па абвінавачванні Жылуновіча пастановай Пракуратуры БССР была спынена з-за недаказаннасці складу злачынства. 10 верасня 1987 года Зміцер Хведаравіч быў поўнасцю рэабілітаваны, у 1988 годзе адноўлены (пасмяротна) у КПСС. У рашэнні Камісіі партыйнага кантролю пры ЦК КПБ гаварылася: «Узнавіць Жылуновіча Дзмітрыя Фёдаравіча членам КПСС з кастрычніка 1988 г. (пасмяротна)».

ЯК З БЕЛАРУССЮ?

Бадай, нікому з беларускіх рэвалюцыянераў і будучых пісьменнікаў не прыйшлося так шмат вандраваць у пошуках працы ў 1909—1913 гады. Працуючы гарбаром, ён бываў у многіх гарадах Беларусі, Украіны, Латвіі і Літвы. Мінск, Бабруйск, Смаргонь, Магілёў, Палтава, Вількамір, Рыга…

Большасць даследчыкаў жыцця і дзейнасці Жылуновіча замоўчваюць той факт, што, жывучы з 1913 года ў Пецярбургу і працуючы фрэзероўшчыкам завода «Вулкан», будучы членам культурна-асветнай суполкі «Веды», «Адукацыя», міжраённай арганізацыі меншавікоў, якая існавала пры заводзе «Святлана», Зміцер Хведаравіч пастаянна падтрымліваў сувязь з рабочымі-беларусамі Пуцілаўскага, Балтыйскага і іншых заводаў сталіцы Расійскай імперыі.

Амаль нічога не гаворыцца пра актыўны ўдзел Жылуновіча ў Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года. Між іншым, адзін з лідараў Беларускай сацыялістычнай грамады, ён разам з рабочымі петраградскіх заводаў атакаваў праабражэнскія казармы, прымаў удзел у захопе гаража на Вялікай Пасадскай, дапамагаў лавіць пераапранутых паліцэйскіх на Неўскім праспекце.

У большасці выданняў замоўчваецца той факт, што ў сакавіку 1917 года сход беларусаў, якія жылі ў Петраградзе, выбраў Жылуновіча дэпутатам Петраградскага савета.

У артыкуле ЭГБ, на жаль, не ўказваецца, што ў кастрычніку 1917 года па ініцыятыве Жылуновіча адбыўся раскол Беларускай сацыялістычнай грамады. Левая яе частка стала супрацоўнічаць з бальшавікамі, а пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі перайшла на пазіцыі Савецкай улады.

14 лістапада 1918 года Прэсненскі раённы камітэт зацвердзіў Маскоўскую беларускую секцыю РКП(б). Бюро, якое ўзначаліў Жылуновіч, унесла ажыўленне ў дзейнасць Беларускага нацыянальнага камітэта, створанага яшчэ ў сакавіку 1917 года. Секцыя ўзяла на сябе функцыю аб'яднання беларускіх арганізацый, што ўзніклі на тэрыторыі Расіі і Беларусі. Хутка Беларуская камуністычная секцыя была створана ў Мінску. Друкаваным органам Белнацкама і секцый стала першая савецкая газета на беларускай мове «Дзянніца» пад рэдакцыяй Жылуновіча.

Між тым канфлікт паміж беларускімі камуністычнымі секцыямі і кіраўніцтвам Заходняй вобласці РСФСР і Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) (у асобе Мяснікова і Кнорына) абвастраўся. 19 лістапада 1918 года «Дзянніца» апублікавала артыкул пад назвай «Як жа з Беларуссю?». Акрамя абвінавачванняў «камісара па нацыянальным справам»

(гаворка ідзе пра Сталіна. — **Э. І.**) і «таварышаў з Заходняй Камуны» (Мяснікова, Кнорына, Калмановіча) у пагардлівых адносінах да самавызначэння Беларусі, у артыкуле ўзнімалася пытанне пра неадкладнасць выпрацоўкі праекта яе нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання. Аўтар матэрыялу Жылуновіч патрабаваў «рашуча паставіць пытанне аб лёсе Беларусі».

Праз восем дён, 27 лістапада, Маскоўскі камітэт беларускіх секцый РКП(б) па ініцыятыве Зміцера Хведаравіча выказаўся на пасяджэнні за абвяшчэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці. Пра сваю пазіцыю дэлегацыя ў складзе Д. Чарнушэвіча, В. Дылы і І. Няцецкага праінфармавала Сталіна, які прыняў іх у сярэдзіне снежня 1918 года.

Праз дзесяць гадоў у адным са сваіх артыкулаў Жылуновіч успамінаў: «Паведамленне пра гэту гутарку, зробленае на агульным сходзе маскоўскай секцыі 15 снежня тт. Дылам, Чарнушэвічам і Няцэцкім, зрабіла вялікае ўражанне на ўсіх яго ўдзельнікаў. Можна было бачыць, што праца камітэту секцыі па скліканню з'езду беларускіх секцый зусім не ўхіляецца ад агульнай палітыкі партыі па нацыянальным пытанні» [1, с. 82].

21—23 снежня 1918 года ў Маскве адбылася канферэнцыя беларускіх камуністычных секцый, якая прыняла наступнае рашэнне: «Усе гэтыя паказальныя факты (меліся на ўвазе выказванні нарады сялянскіх дэпутатаў Мінскай губерніі за самавызначэнне беларускага і літоўскага народаў і падтрымка гэтай ініцыятывы Мінскім губернскім рэвалюцыйным камітэтам, які лічыў, што ўмовы барацьбы за Савецкую ўладу патрабуюць абвяшчэння нацыянальнай дзяржавы ў той форме, якая была прапанавана ў верасні 1918 года Белнацкамам на III з'ездзе Саветаў Заходняй вобласці. — **Э. І.**) уладна вымагаюць стварэння, у шчыльнейшым кантакце з вялікаю Расійскаю сацыялістычнаю федэрацыйнаю рэспублікай, моцнага беларуска-сялянскага ўраду, выяўніка беларускай беднаты» [1, с. 90].

Канферэнцыя выбрала Цэнтральнае бюро беларускіх секцый у складзе З. Жылуновіча (старшыня), А. Чарвякова, Ф. Балбекі, І. Няцэцкага, М. Дракона, В. Дылы.

У дзень закрыцця канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б) Зміцер Хведаравіч з боллю даведаўся, што УЦВК прыняў пастанову «Аб абласных аб'яднаннях». Паводле яго па хадайніцтве Паўночна-Заходняга абкама партыі і Аблвыканкамзаха, падтрыманым НКУС РСФСР, Заходняя вобласць як тэрытарыяльна-адміністраціўная адзінка РСФСР была зацверджана ў складзе Смаленскай, Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай абласцей. Дадзенае рашэнне, зразумела, не магло задаволіць кіраўнікоў Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б). Яны настойліва выступалі за стварэнне незалежнай Беларускай Савецкай Рэспублікі.

Думка аб прававым статусе Беларусі ў Крамлі змянілася літаральна за адзін дзень. Рашэнне ў ЦК РКП(б) пра абвяшчэнне Беларускай рэспублікі было прынята 24 снежня 1918 года. На жаль, тэкст дакумента ЦК РКП(б) з рашэннем пра стварэнне беларускага ўрада да сённяшняга часу не знойдзены.

Гэта рашэнне стала вядома Белнацкаму 25 снежня 1918 года. Менавіта у той жа дзень Сталін запрасіў да сябе Жылуновіча і іншых адказных работнікаў і «ўзняў пытанне аб дзяржаўным уладкаванні Беларусі». Гэта быў адказ Белнацкаму иа артыкул «Як жа з Беларуссю?» у газеце «Дзянніца».

29 снежня 1918 года Сталін тэлеграфаў Мяснікову ў Смаленск:

«Сегодня выезжают в Смоленск белорусы. Везут с собой Манифест. Просьба ЦК партии и Ленина принять их как младших братьев...»[2, л. 4].

Кіраўнікі Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б) змаглі выехаць з Масквы ў Смаленск не 29 снежня, а на дзень пазней. Яны везлі праект Маніфеста і пісьмо Сталіна. У апошнім, хутчэй за ўсё, змяшчаўся персанальны спіс будучага ўрада ССРБ. Нягледзячы на тое, што быў узгоднены яго колькасны і персанальны склад, па прыездзе ў Смаленск у Жылуновіча і яго групы пачаліся спрэчкі.

Справа ў тым, што Зміцер Хведаравіч лічыў, што Цэнтральнае бюро КП(б)Б, як і ўрад, павінна быць створана на парытэтных пачатках. І ў гэтым ён не меў рацыі. У выніку ў склад ЦБ з 15 членаў бюро было выбрана толькі два прадстаўнікі беларускіх камуністычных секцый — З. Х. Жылуновіч і І. В. Лагун.

www.maladost.lim.by Дзённічак.
Старонкі жыцця літаратурнай рэдакцыі
Маладосць

19 лістапада 1918 года «Дзянніца» апублікавала артыкул пад назвай «Як жа з Беларуссю?». Аўтар матэрыялу Жылуновіч патрабаваў «рашуча паставіць пытанне аб лёсе Беларусі»

Сталін нагадаў, што «ўрад будзе знаходзіцца ў прамой сувязі з ЦК і падпарадкоўвацца яму». Цікава, што Сталін і Мяснікоў ужывалі тэрмін «падпарадкаванне». Быццам бы ЦК РКП(б) і ЦБ Кампартыі Беларусі з'яўляліся вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады.

Можна меркаваць, што Жылуновіч, лічачы, што ўшчымлены правы беларускіх секцый у ЦБ КПБ, у якасці «кампенсацыі» настойваў на неўключэнні ў склад урада трох камісараў: па ваенных справах (А. Мяснікоў), па забяспячэнні (М. Калмановіч), старшыні Савета народнай гаспадаркі (Р. Пікеля). Усе былі прадстаўнікамі абласнога цэнтра.

Атрымаўшы паведамленне са Смаленска пра сітуацыю, Сталін адправіў тэлеграму Мяснікову: «Предложення Жнлуновнча о невключеннн 3-х членов нахожу дезорганнзаторскнмн н в корне протнворечашнмн решениям партий. Ннкакнх особых решеннй группы Жнлуновича не может быть. Спнсок членов — всего 17 — является окончательным. Я требую от Жнлуновпча, его группы, категорнческого ответа на вопрос, подчпняются лн они беспрекословно решенпю ЦК партнп. Жду срочного ответа. По поручению ЦК партнн — Сталнн» [2. л. 23].

У архіве захоўваецца яшчэ адна тэлеграма наркамнаца — адрасаваная Жылуновічу. Сталін настойвае на тэрміновым апублікаванні Маніфеста пра абвяшчэнне Беларускай рэспублікі. Іншыя спрэчныя пытанні можна было вырашыць і потым.

Самае цікавае было ў тым, што Зміцер Хведаравіч, зацверджаны старшынёй першага беларускага савецкага ўрада на экстраным пасяджэнні Белнацкама ў Маскве, прыехаў разам з дванаццаццю сваімі саратнікамі ў Смаленск толькі 31 снежня, і на канферэнцыю, якая была абвешчана I з'ездам КП(б)Б, спазніўся! Але гэта не мела значэння: Масква не любіла, каб ёй пярэчылі.

ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР

Стварэнне першага савецкага ўрада Беларусі ў самым канцы 1918 года і абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь 1 студзеня 1919-га. Гэтыя падзеі непарыўна звязаны з імем Жылуновіча.

Амаль чвэрць стагоддзя таму, 24 чэрвеня 1988 года, у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ адбылося пасяджэнне «круглага стала», арганізаванае каардынацыйным камітэтам па праблемах гісторыі БССР і Кампартыі Беларусі. На ім абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з утварэннем БССР, з роляй, якую адыгралі ў гэтым працэсе Паўночна-Заходні абласны камітэт і беларускія нацыянальныя секцыі пры ЦК партыі.

На пасяджэнні выступіў загадчык аддзела Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы, доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс. Ён сказаў: «Я хачу ўвесці ва ўжытак такі цікавы матэрыял, як успаміны Язэпа Дылы, які быў у першым беларускім савецкім урадзе наркамам працы (для сустрэчы з ім Адам Мальдзіс спецыяльна ездзіў у Саратаў, дзе жыў Я. Дыла. — **Э. І.**). Ён расказваў пра ўзаемаадносіны паміж Гартным і Мясніковым, якія былі вельмі складанымі. Дайшло да таго, што па загадзе Мяснікова Жылуновіч і Дыла былі арыштаваны. Жылуновіч знайшоў спосаб адправіць тэлеграму Леніну».

Мала каму вядома, што па ініцыятыве і пад старшынствам «першага беларускага савецкага прэм'ер-міністра» Зміцера Жылуновіча на пасяджэнні гэтага ўрада 27 студзеня 1919 года былі прыняты чатыры важныя пастановы [3. л. 13—14].

Згодна з першай зацверджана рашэнне заснаваць пры Камісарыяце замежных спраў аддзел па зборы матэрыялаў пра бясчынствы, канфіскацыі і ўсялякія беззаконні, прычыненыя нямецкімі акупацыйнымі ўладамі.

Вынікам другой пастановы стала адпраўка ў галодную Маскву прадметаў харчавання. Трэцяя прынцыповая пастанова: «Даручыць Камісарыяту замежных спраў хадайнічаць перад Цэнтрам РСФСР (так у тэксце. — **Э. І.**) аб звароце Беларускай рэспублікі ўсёй эвакуіраванай маёмасці».

Пасля даклада члена ўрада па Камісарыяту народнай адукацыі пра забарону ва ўстановах і школах Беларусі вывешваць адлюстраванне рэлігійнага культу, урад пастанавіў: «Падцверзіць дэкрэт аб недапушчэнні адлюстраванняў рэлігійнага культу ва ўстановах і школах».

ІНБЕЛКУЛЬТ

У публікацыях пра Жылуновіча амаль нічога не прысвечана яго дзейнасці ў Інстытуце беларускай культуры (акрамя ўспаміну, што ён быў членам Прэзідыума Інбелкульта). Тэма «З. Х. Жылуновіч і Інстытут беларускай культуры» яшчэ чакае свайго даследчыка. Між тым, уся гісторыя Інбелкульта, пачынаючы са стадыі падрыхтоўкі адкрыцця і да пераўтварэння ў Беларускую Акадэмію навук, звязана з імем гэтага чалавека.

У студзені 1921 года рэспубліканскі друк паведамляў, што 23 студзеня ў памяшканні Камісарыята асветы адбыўся збор беларусаў — працаўнікоў асветы і культуры. На збор сышлося каля сямідзесяці чалавек. Мэтай збору было адчыненне Інстытута беларускай культуры.

Для далейшай распрацоўкі плана работ па заснаванні ІБК выбрана ў ліку сямі чалавек: тт. Некрашэвіча, Купалы, Бялькевіча, Жылуновіча і Бадуновай і двух кандыдатаў: Родзевіча і Дземідовіча [4].

У лютым 1921-га пытанне пра стварэнне інстытута, які б займаўся вывучэннем беларускай культуры, абмяркоўвалася на 2-й сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта ССРБ. Была створа камісія па выпрацоўцы статута Інстытута беларускай культуры пад кіраўніцтвам З. Х. Жылуновіча. Праект статута надаваў Інбелкульту характар навукова-даследчай і грамадска-культурнай установы.

Праз чатыры месяцы — 29 мая 1921 года — адбыўся сход Калегіі навукова-літаратурнага аддзела Народнага камісарыята асветы БССР, на якім прысутнічалі З. Жылуновіч, С. Некрашэвіч, Я. Луцэвіч. К. Міцкевіч і Я. Дыла. Старшынёй сходу быў Жылуновіч, а пісарам — Дыла. Сход прыняў наступную пастанову: «Выходзячы з таго, што Інбелкульт, паскольки ён будзе пабудаваны пры Дзярж[аўным] універсітэце — рассадніку чыста расейскай культуры, ні ў якім выпадку не будзе беларускай інстытуцыяй і прытым чыста акадэмічнай арганізацыяй, тады як маладой беларускай культуры патрэбен Інбелкульт як творчая ініцыятыўная лабараторыя беларускай культуры, — прызнаць, што Інбелкульт павінен быць адчынены як найхутчэй і ніяк ні пры універсітэце, а як самастойная пры Наркамасвеце інстытуцыя, злучаючая ўсе творчыя белар. навук. літарат. і мастацкія сілы.

Лічыць патрэбным канчаткова рэдагаваць статут Інбелкульта з тым, што ён павінен на тым быць паданым на зацверджанне дзяржаўных інстанцый» [5, л. 82—84 адв.].

Праз некалькі дзён, 1 чэрвеня, пад старшынствам Жылуновіча прайшоў сход Навукова-літаратурнай калегіі пры Народным Камісарыяце асветы БССР, які пастанавіў: «Падцвердзіць папярэднюю пастанову аб Інстытуце белар. культуры, распрацаваць уставу і падаць яе на зацвярджэнне Камасветы. Канстатуючы непарадкі ў перахове культурных вартасцяў Беларусі, н[авукова]-літаратурны аддзел пастанавіў звярнуцца да Камасветы і прасіць аддаць гэтую справу пад загад і дбанне нав.-літ. аддзела,. каб захаваць ад знішчэння музеі, архівы і іншыя культурныя вартасці» [5, л. 90—90 адв.].

Як вядома, ІБК быў заснаваны 30 студзеня 1922 года. Не пазней 8 сакавіка таго ж года Статут Інстытута беларускай культуры быў надрукаваны. У ім адзначалася, што Інбелкульт ёсць найвышэйшая культурна-навуковая ўстанова ў Беларусі і што ён мае сваім заданнем «навукова-даследчую працу ў межах этнаграфіі, мовазнаўства, літаратуры, мастацтва, гісторыі і прыродазнаўства Беларусі, а таксама агульнае кіраванне ўсімі навуковымі інстытуцыямі, якія працуюць на глебе Беларусі» [6, л. 94].

26 сакавіка 1924 года агульны сход Інбелкульта пастанавіў стварыць сем новых секцый, у тым ліку этнаграфіі і геаграфіі (М. Азбукін), гісторыка-археалагічную (В. Друшчыц), сацыяльна-эканамічную (Е. Успенскі і З. Жылуновіч). [7, л. 16].

31 студзеня 1925 года, праз месяц пасля рашэння сакратарыята ЦК Кампартыі

www.maladost.lim.by Блогасфера.
Самыя аўтарытэтныя блогеры
Маладосць

Беларусі зацвердзіць Жылуновіча членам Прэзідыума ІБК, на агульным сходзе Інбелкульта па прапанове иамесніка наркама асветы рэспублікі А. В. Баліцкага ён выбраны на гэту ганаровую пасаду [10, л. 1—2].

На агульным сходзе членаў Інстытута беларускай культуры Жылуновіч выбіраецца членам рэдакцыйнай калегіі ІБК і члеиам камісіі па выданні твораў Леніна і марксісцкіх твораў.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца цікавы дакумент. Гэта пратакол распарадчага пасяджэння Савета Народных Камісараў БССР ад 5 чэрвеня 1925 года. Прывядзём фрагмент:

«[…] Слушали: 25. Об отпуске средств на высылку в Западную Европу кннг по белорусской культуре.

Постановилн: 25. Заслушав доклад председателя Ннбелкульта тов. Нгнатовского об отправке за границу кннг по белорусской культуре, признать целесообразным в целях ознакомления Западной Европы с белорусской культурой признать целесообразным командировать за границу в Германию н на Парижскую художественную выставку для налаживаиия связи с немецкими и французскимн пролетарскими пнсателями членов Инбелкульта и белорусских поэтов тт. Жилуновича, Луцевича и Кудзелько» [11, л. 24—26].

Нягледзячы на выключную занятасць Зміцера Хведаравіча на вышэйшых дзяржаўных пасадах, яго дзейнасць у Інбелкульце была шматграннай і садзейнічала развіццю беларускай навукі і культуры. Пра гэта, у прыватнасці, сведчаць яго шматлікія публікацыі ў рэспубліканскім друку. Толькі за адно дзесяцігоддзе (1918—1928 гады) Жылуновічам было напісаиа звыш 300 артыкулаў на розныя тэмы.

У размове з аўтарам гэтых радкоў беларуская даследчыца, а потым загадчык беларускага аддзела Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна Ю. В. Бібіла, якая асабіста ведала амаль усіх беларускіх пісьменнікаў, адзначыла, што Цішка Гартны быў самым эрудзіраваным з іх, асабліва ў галіие гісторыі Беларусі. Яна таксама дадала, што не ўяўляе сабе гісторыі Інбелкульта без дзейнасці Зміцера Жылуновіча.

З МЭТАЙ ВЫДАННЯ БЕЛАРУСКІХ ПАДРУЧНІКАЎ І ЛІТАРАТУРЫ

У энцыклапедычных і даведачных выданнях нашай краіны, на вялікі жаль, замоўчваецца ўклад Жылуновіча ў ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі, не раскрыта яго барацьба з ворагамі беларусізацыі, якія займалі высокія пасады ў кіраўніцтве БССР таго часу.

Яшчэ да ўтварэння ССРБ, з ліпеня да жніўня 1918 года па ініцыятыве Белнацкама ў Маскве працаваў Беларускі народны ўніверсітэт, заняткі якога наведвалі 57 чалавек, пераважиа школьныя настаўнікі Беларусі. Яны праслухалі лекцыі па беларускай гісторыі, літаратуры, мове, эканоміцы, геаграфіі і іншых дысцыплінах. Частка лекцый была выдадзена ў 1920 годзе ў Маскве пад назвай «Курс беларусазнаўства». Сярод лектараў былі расійскі гісторык У. І. Пічэта, расійскі і беларускі мовазнавец П. А. Растаргуеў, беларускі пісьменнік, загадчык выдавецкага аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята З. Х. Жылуновіч.

Пра такі тып беларусаў як Жылуновіч добра сказаў Язэп Лёсік на пахаванні намесніка наркама замежных спраў Беларусі А. Бурбіса: «Яиы былі не толькі пісьменнікамі, паэтамі, не толькі вучонымі і грамадскімі дзеячамі, не толькі рэвалюцыяиерамі-сацыялістамі і камуністамі, а былі яшчэ і беларусамі. Яны неслі на плячах свой падвойны крыж і гэтым другім крыжам была іх беларуская справа, иацыянальнае адраджэнне» [12, с. 70].

У фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь захоўваецца пратакол нарады Наркамасветы ССРБ па пытанні пра ўзмацненне працы па выданні беларускіх кніг ад 9 лютага 1921 года, на якой прысутнічалі намеснік наркама асветы Беларусі т. Фрумкіна, загадчык Беларускага дзяржвыдата т. Эдэльман, загадчык літаратурна-выдавецкага аддзела Наркамасветы т. Некрашэвіч. У пастанове гэтай нарады ёсць такія радкі: «…приннмая во внимание, что слабый и до конца расстроенный типографский аппарат, находящнйся в Минске, может исполнить только незначительную часть требований, которые согласно постановлению ЦИК Белоруссии предлагают-

ся и белорусским изданиям, обратиться в Центральное управленне Госиздата с просьбой организовать в кратчайший срок заграничное изданне белорусских и еврейских книг. Для проведения названного постановления командировать в Москву членов коллегии Белорусского госнздата тт. Жилуновнча (ва ўсіх публікацыях ира гэту асобу не называецца пасада. — **Э. І.**), Эдельмана и зав. лит.-нзд. отделом Наркомппроса Белоруссии т. Некрашевича» [13, л. 20].

У сакавіку 1922 года ён накіроўваўся ў Берлін з мэтай выдання беларускіх падручнікаў і літаратуры.

ДАЛІКАТНАЕ ДАРУЧЭННЕ

Мала каму вядома, што восенню 1925 года ў разгар працэса палітыкі беларусізацыі, Жылуновічу прыйшлося выканаць даручэнне ЦК Камиартыі Беларусі і асабіста першага сакратара ЦК Аляксандра Крыніцкага.

Яшчэ 11 жніўня 1925 года ЦК КП(б)Б зацвердзіў илан паездкі З. Жылуновіча і М. Чарота ў Прагу, дзе знаходзілася кіраўніцтва так званай Беларускай Народнай Рэспублікі. ЦК Камиартыі Беларусі ирыняў пастанову, у якой лічыў мэтазгодным склікание старшынёй Рады народных міністраў БНР А. Цвікевічам у Берліне беларускай канферэнцы пры сямі абавязковых умовах. Адной з іх з'яўлялася папярэдняе прызнанне Мінска як адзінага культурнага і палітычнага цэнтра, на які павінен арыентавацца беларускі рух Польшчы, Літвы, Латвіі і іншых краін. Акрамя таго, кіраўніцтва БНР павінна было адмовіцца ад арыентацыі на Лігу Нацый і перад канферэнцыяй павінна была адбыцца «перадача паўнамоцтваў БНР Ураду БССР у форме дэкларацыі». Пасля прыняцця гэтых умоў групай А. Цвікевіча меркавалася фінансаваць будучую канферэнцыю.

У кастрычніку 1925 года ў Прагу для работы сярод беларускай эміграцыі выехалі З. Жылуновіч, М. Чарот і Янка Куиала.

Другая Усебеларуская палітычная канферэнцыя або Берлінская канферэнцыя 1925 года адбылася 12—16 кастрычніка 1925 года. У Берлін для ирыняцця «мандатаў» сиецыяльна прыехалі Жылуновіч — як прадстаўнік кіраўніцтва БССР, і намеснік иаўнамоцнага прадстаўніка СССР у Польшчы А. Ульянаў. Менавіта на Берлінскай канферэнцыі 15 кастрычніка 1925 года адбылося ирызнанне БССР беларускай нацыянальнай дзяржавай. Праўда, большасць кіраўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі пайшла на роспуск БНР і прызнанне БССР, а меншасць заставалася за мяжой і працягвала праводзіць ранейшую лінію.

На вялікі жаль, замоўчваецца ўклад Жылуновіча ў ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі, не раскрыта яго барацьба з ворагамі беларусізацыі, якія займалі высокія пасады ў кіраўніцтве БССР таго часу

30 ліпеня 1926 года на закрытым пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б быў зацверджаны склад Літаратурнай камісіі на чале з У. М. Ігнатоўскім. У склад камісіі ўвайшлі А. Ф. Адамовіч (намеснік старшыні), Б. Э. Аршанскі, Б. А. Вансоўскі, З. Х. Жылуновіч (пра гэта нічога не гаворыцца ў публікацыях пра яго. — **Э. І.**), М. Чарот (Кудзелька М. С.), М. А. Акулік, М. П. Абрамчук, М. Я. Зарэцкі, А. В. Баліцкі, В. А. Сербента [14, л. 59].

У пастанове Літаратурнай камісіі пра тэзісы да иытання пра ўтварэнне літаратурна-мастацкага аб'яднання «Узвышша» адзначаецца:

«Лірыка адраджаністаў выражае і выяўляе: ...г) настроі нацыянальна і сацыяльна ўсвядомленага рамесніцтва. Ц. Гартны выражае іх ираз выяўленне адмоўнага ў стане работніка-рамесніка. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Ц. Гартны пераходзіць да выяўлення і ўсхвалення агульнага, станоўчага рэвалюцыі і выяўленне "трэсак на хвалях" яе» [15, л. 18—22].

7 снежня 1928 года газета «Звязда» апублікавала артыкул сакратара ЦК КП(б)Б І. А. Васілевіча «Аб нацыянал-дэмакратызме ў культурным будаўніцтве». У гэтым артыкуле Зміцер Хведаравіч Жылуновіч стаў адным з галоўных аб'ектаў крытыкі. Прывядзём тры сказы.

«На старонках друку і ў паасобных выступленнях рад таварышаў (Жылуновіч, Зарэцкі і Глыбоцкі) высоўваюць наступнае асноўнае, на чым, па іх думцы, павінна «развівацца» беларуская нацыянальная культура ў БССР».

«Іншымі словамі, па думцы гэтых таварышаў, сёння беларуская культура павінна развівацца па нашаніўскім перыядзе».

«Яны Кастрычніцкую рэвалюцыю разглядаюць як адзін з этапаў барацьбы за вызваленне беларускага народа, пачаты ў эпоху Скарыны, Багушэвіча і да іх падобных...»

16 студзеня 1931 года Жылуновіч пастановай ЦКК КП(б)Б быў выключаны з партыі, а 15(16) лістапада ноччу арыштаваны органамі НКУС БССР.

МІНУС І ЛІЧБА 12

У пачатку 1970-х гадоў мне давялося сустрэцца з дачкой Зміцера Хведаравіча Галінай — вучоным-лексікографам. У той час яна працавала навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства АН БССР, а я быў аспірантам Інстытута гісторыі АН БССР і пісаў кандыдацкую дысертацыю пра акадэміка АН СССР і АН БССР У. І. Пічэту. Трэба было расшыфраваць адзін групавы фотаздымак супрацоўнікаў Інбелкульта, і мне параілі звярнуцца па дапамогу да Галіны Змітраўны Жылуновіч. Памятаю, калі яна ўзяла ў рукі гэты фотаздымак, то рукі яе задрыжалі. Яна сказала: «Я не буду расшыфроўваць гэту фатаграфію. І наогул, я нічога не ведаю пра Інбелкульт».

Я зразумеў, што яна шмат перажыла як дачка «ворага народа», і загаварыў на іншую тэму: «Чым займаецца цяпер Інстытут мовазнаўства АН БССР?» Яна трохі ажывілася.

Пасля гэтай размовы я папрасіў Галіну Змітраўну расказаць пра абставіны арышту і пра тое, як яны з маці і братам Алегам жылі падчас знаходжання бацькі ў турме і пасля яго смерці. Праз паўзу яна пачала расказваць.

«Вельмі цяжка пра ўсё гэта ўспамінаць. Мне ўдалося даведацца, што бацьку жорстка катавалі чацвёра сутак падрад. Нездарма мне потым казалі, што ён звар'яцеў і быў перавезены з Мінскай турмы ў Магілёўскую псіхіятрычную лячэбніцу.

Было вельмі жахліва і страшна. Суседзі і знаёмыя баяліся адчыніць нам дзверы. Праз нейкі час пасля арышту бацькі нас таксама забралі.

Адзін са следчых, які вёў справу бацькі, прапанаваў нам пакінуць Мінск, а яшчэ лепш — з'ехаць з Беларусі. Хутка мне і маці ў пашпартах праставілі штамп са злавесным знакам «мінус». І лічбу 12. Гэта азначала, што нам забараняецца жыць у 12 самых буйных гарадах СССР. Калі мы паказвалі свае пашпарты ў аддзеле кадраў, то кадравікі моршчыліся і не жадалі браць нават на такую працу, дзе плацілі грашы.

Мне вельмі не хочацца ўспамінаць усе цяжкасці, якія нам давялося перажыць.

Мне сёння сумна ўспамінаць пра брата Алега, які загінуў у 1942 годзе, абараняючы горад Ленінград. У яго быў вельмі дрэнны зрок, і ваенкамат выдаў яму «белы» білет, і ён мог эвакуіравацца. Спачатку Алег працаваў санітарам у шпіталі. А потым пайшоў на фронт».

ЛІТАРАТУРА

1. Жылуновіч З. Беларускія секцыі РКП і стварэнне Беларускай савецкай Рэспублікі / З. Жылуновіч // Полымя. — 1928. — № 1.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НА РБ). Ф. 60. Воп. 1. Спр. 337.
3. НА РБ. Ф. 809. Воп. 1. Спр. 6.
4. Савецкая Беларусь — 1921 — 25 студзеня.
5. НА РБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 107.
6. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. А-2307. Воп. 3. Спр. 153.
7. НА РБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 535.
8. НА РБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1285.
9. Тамсама. Воп. 21. Спр. 23.
10. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 12.
11. НА РБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 183.
12. Каўка А. Перад усім — адданасць Беларусі / А. Каўка // Беларускі гістарычны часопіс. — 1993. — № 4.
13. НА РБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 29.
14. НА РБ. Ф. 4п. Воп. 3. Спр. 18.
15. Тамсама. Воп. 21. Спр. 72.